



# Мост у будучыню

***Таленавітыя маладыя людзі з Беларусі і Расіі былі ў цэнтры ўвагі падчас святкавання 10-годдзя падпісання Дагавора аб утварэнні Супольнасці Беларусі і Расіі. Гэтай жа падзеі была прысвечана Міжнародная канферэнцыя "Моладзь і мастацтва — мост у будучыню", якая прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.***

Арганізатары канферэнцыі — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, Расійскі цэнтр міжнароднага навуковага і культурнага супрацоўніцтва пры Міністэрстве замежных спраў Расійскай Федэрацыі, Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь, Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры і Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

Канферэнцыя праходзіла па прынцыпе "круглага стала", у форме дыялога. Намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь **Валерый Гедройц** зазначыў:

— Любая нацыянальная культура, замкнутая ў сваіх межах, многа страчвае і непазбежна прыходзіць у занапад. І наадварот становіцца багацейшай, калі падтрымлівае сяброўскія сувязі з суседзямі. Мы зацікаўлены ў наладжванні кантактаў з Расіяй, і гэтыя кантакты ідуць на карысць абодвух народаў. Мы захавалі тую плённую сістэму супрацоўніцтва, якая закладзена ў савецкія часы і была эфектыўнай для нашых культур.

Зараз прынята Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця беларускай вёскі да 2010 года, якая прадугледжвае стварэнне ў сельскай мясцовасці школ мастацтва, іх філіялаў, класаў. Аснова іх работы — гэта нацыянальная культура, гістарычная культурная спадчына народа.

Дарэчы, сёлета на першы курс Акадэміі музыкі, Акадэміі мастацтваў і Універсітэта культуры і мастацтваў залічана 1732 студэнты. Таму нашай моладзі новыя культурныя праекты з Расіяй вельмі спатрэбяцца, — падкрэсліў В. Гедройц.

З расійскага ж боку праекты, якія можна сумесна рэалізаваць, прапанавала **Таццяна Паласкова**, доктар палітычных навук, начальнік Упраўлення па рабоце з суайчыннікамі, краінамі СНД і Балтыі Расзамежцэнтра пры МЗС Расіі. Яна нагадала, што ёсць дабрачынны праект "Рускі салон", які падтрымлівае маладых таленавітых выканаўцаў класічнай музыкі краін СНД. У гэты праект ёсць магчымасць уключаць таленавітую моладзь з Беларусі.

Расзамежцэнтр налічвае ўжо 80 гадоў і мае больш чым 40 цэнтраў навукі і культуры за мяжой: выставачныя і канцэртныя залы, гатэльныя комплексы.

Раман Матульскі, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, падтрымаў госцю і таксама прапанаваў выкарыстоўваць вялікія бібліятэчныя плошчы для сумесных культурных праектаў.

Пытанні патрыятычнага выхавання моладзі на падмурку духоўнасці агучылі прадстаўнікі маладзёжных арганізацый Расіі і Беларусі. Цікавай падалася праца ў будаўнічых атрадах, пра якія паведаміў *старшыня штаба маладзёжных студэнцкіх атрадаў Паўднёвай* Адміністрацыйнай акругі г. Масквы **Канстанцін Загароднікаў**. Зараз у Маскве больш чым 30 будатрадаў, гэта найчасцей звычныя будаўнічыя і педагагічныя маладзёжныя атрады. Але ёсць і новыя кірункі працы — працоўны атрад Міністэрства надзвычайных сітуацый, "гандлёвы" атрад, які арганізуе гандаль на вуліцы, з латкоў. Моладзь гандлюе прахаладжальнымі напоямі, хоць гэта не надта прыбыткова, але выгадна для маладых, якія атрымліваюць неблагі дадатак да стыпендыі і могуць працаваць круглы год, а не толькі ў летні перыяд. Таксама ёсць сервісны атрад, які складаецца з афіцыянтаў, барменаў і нават горнічных, ёсць студэнцкі атрад праваднікоў у цягніках.



У межах канферэнцыі ў камернай зале Белдзяржфілармоніі прайшоў святочны гала-канцэрт "Маладыя таленты Беларусі і Расіі — XXI стагоддзе", дзе выступілі маладыя выканаўцы з Мінска, Магілёва і Масквы.

Пасля гала-канцэрта **Наталля Аўдзеева,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэх-

нічным прагрэсе, старшыня савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі пагадзілася на каментарый падзеі.

***— Наталля Пятроўна, якія важныя сумесныя акцыі, мерапрыемствы, фестывалі адбыліся апошнім часам з удзелам стыпендыятаў фонду?***

Сёлета на пачатку жніўня на працягу тыдня ў Анапе праходзіў першы Міжнародны фестываль пад дэвізам "Моладзь за саюзную дзяржаву", прысвечаны 10-годдзю падпісання Дагавора аб утварэнні супольнасці Беларусі і Расіі. Гэты праект саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, запланаваны дзеля таго, каб наша моладзь прымала актыўны ўдзел у будаўніцтве саюзнай дзяржавы. Вельмі сур'ёзнай была грамадска-палітычная і творчая складаючая фестывалю. Моладзь поруч з намі, дарослымі, прадстаўнікамі міністэрстваў і ведамстваў, членамі кіраўніцтва саюзнай дзяржавы працавала на сумеснай прэс-канферэнцыі па праблемах саюзнага будаўніцтва, адкрытым пашыраным пасяджэнні Камісіі парламенцкага сходу па сацыяльных пытаннях, куды былі запрошаны і ўдзельнічалі маладыя людзі абедзвюх краін, удзельнічалі ў закладцы алеі саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, Цырымоніі ўскладання кветак да помнікаў воінаў, якія абаранялі нашу агульную дзяржаву ў гады Вялікай айчыннай вайны, у палітычных дыспутах. Цікава былі арганізаваны творчыя вечары дружбы, паказы творчых дасягненняў, што ладзіліся на базе стадыёна санаторыя "Жамчужына Расіі". Рэжысёрска-пастановачную групу ўзначальваў Аляксандр Бярэзін, рэжысёр-пастаноўшчык творчых акцый фестывалю "Славянскі базар у Віцебску". Ад Беларусі выступала Марына Васілеўская, харэаграфічны калектыў сучаснага танца з Віцебска, спявала Ксенія Сітнік.

***— Якія вынікі мерапрыемства, бо, зразумела, гэта не аднаразовая акцыя?***

— Мы вызначыліся і ад імя Камісіі Парламенцкага сходу па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях, якую прадстаўляюць парламентарыі Беларусі і Расіі, будзем прапаноўваць Савету Міністраў Саюзнай дзяржавы і Вышэйшаму дзяржаўнаму Савету, каб фестываль стаў пастаянным. У 2007 годзе мяркуем, што ён зноў пройдзе ў Анапе ў верасні. Гэта вельмі патрэбна і важна, бо моладзь —наш агульны клопат, наша сучаснасць і будучыня.

— Такія сустрэчы павінны стаць рэгулярнымі, — падвяла вынікі нашай размовы Наталля Аўдзеева. — Цікава, што па ходзе мерапрыемства назва канферэнцыі сама сабой неяк непрыкметна скарэкціравалася і плаўна перайшла да такой: "Моладзь і культура — мост у будучыню", і я з гэтым згодна, бо сапраўды культура — больш шырокае і глыбокае паняцце.

**Галіна ЛАНД**

***На здымках: дырэктар НББ Раман Матульскі, рэктар Бел ДІПК Ірына Багачова, намеснік міністра культуры Валерый Гедройц; Лізавета Каралёва; "круглы стол" падчас канферэнцыі.***